**24.** Дадзены выразы з баек Кандрата Крапівы:

*1) Другі баран – ні "бэ", ні "мя",*
*А любіць гучнае імя.*

*2) Ты паможаш так каню,*
*Як хваробе кашаль.*

*3) Паверце, што найбольшая з заслуг –*
*Цягнуць цяпер у згодзе плуг.*

*4) Узяўся ты за гуж, дык не кажы – не дуж.*

У якіх байках яны сустракаюцца?

*а) "Дзед і Баба"; б) "Стары і малады"; в) "Дыпламаваны Баран"; г) "Вараны".*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в. **В)** 1-б, 2-а, 3-в, 4-г.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-г.

**25.** Літаратурным псеўданімам *Шаўцы* карысталіся ў беларускай літаратуры:

*1) Паўлюк Трус; 2) Пятро Глебка;*
*3) Барыс Сачанка; 4) Уладзімір Дубоўка.*

Выберыце правільныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2.
**Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** У якіх прыкладах з дадзеных правільна ўтворана найвышэйшая ступень параўнання прыслоўяў?

*1) найбольш поўна адлюстраваны; 2) лепш за ўсё запомнілася;*
*3) больш за ўсіх расказваў.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма правільных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**27.** Да якога разраду адносяцца часціцы *вось, абы толькі*?

**А)** нельга вызначыць. **Б)** сэнсавыя. **В)** мадальныя.
**Г)** эмацыянальныя. **Д)** формаўтваральныя.

**28.** Устойлівы выраз *ісці за вадою* мае значэнне … .

**А)** хутка штосьці рабіць. **Б)** быць разважлівым.
**В)** не губляць раўнавагу. **Г)** спакойна наглядаць за чымсьці.
**Д)** дзейнічаць без разважання, не думаючы.

**29.** ***Тэонімы*** – гэта … .

**А)** назвы дробных, невялікіх прадметаў. **Б)** імёны багоў, міфалагічных істот.
**В)** назвы населеных пунктаў. **Г)** уласныя імёны (клічкі) жывёл.
**Д)** назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў.

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова меў літаратурны псеўданім *Ганна Крум*?

**А)** Алаіза Пашкевіч. **Б)** Канстанцін Міцкевіч. **В)** Ванда Лявіцкая.
**Г)** Уладзімір Дубоўка. **Д)** Барыс Сачанка.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 11500 экз. г. Мінск. 2012 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2012»

*Чацвер, 16 лютага 2012 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца тдрыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/.

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Падбярыце сінонім да ўстойлівага спалучэння *на шапачны разбор*.

**А)** рана. **Б)** позна. **В)** своечасова. **Г)** хутка. **Д)** якасна.

**2.** Як называўся ў народзе язычніцкі бог урадлівасці і кахання?

**А)** Ярыла. **Б)** Зюзя. **В)** Жыжаль. **Г)** Пярун. **Д)** Дажбог.

**3.** Якое слова прапушчана ў вершаваных радках Якуба Коласа?

*Між алешын, кустоў,*
*Дзе пяе …,*
*І шуміць, і грыміць*
*Срэбразвонны ручэй…*

**А)** шпак. **Б)** верабей. **В)** салавей. **Г)** дрозд. **Д)** жураўель.

**4.** Які адпаведнік у беларускай мове мае дзеяслоў з рускай мовы *отрядить*?

**А)** паслаць. **Б)** адрадзіць. **В)** адхінуць. **Г)** пачаставаць. **Д)** здзейсніць.

**5.** Дадзены прыметнікі: *1) паверхавы; 2) верхні; 3) павярхоўны.*
Які прыметнік мае значэнне *'негрунтоўны, неглыбокі'*?

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** усе прыметнікі. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**6.** Дадзены сказы:

*1. Усе выпускнікі _ смеючыся _ паселі за парты.*
*2. Углядаючыся ў першую снежную раніцу _ яна яшчэ доўгавата стаяла на ганку.*
*3. Але _ не вытрымаўшы _ зноў узяўся за фарбы і пачаў маляваць.*

У якім(-іх) сказе(-ах) на месцы пропуску неабходна паставіць коскі?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3.

**7.** Вызначце від дадзенага сказа:
*Не паняць таго ніколі,* *Не даюць мне думаць зыкі,*
*Не разведаць, не спазнаць:* *Што ляцяць, дрыжаць, звіняць* (Максім Багдановіч).
**А)** просты сказ. **Б)** складаназлучаны сказ. **В)** складаназалежны сказ.
**Г)** складаны бяззлучнікавы сказ. **Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

**8.** Вызначце з прапанаваных складаны назоўнік, які пішацца праз злучок:
*1) гідра_самалёт; 2) лён_даўгунец; 3) стара_друк.*
**А)** усе дадзеныя назоўнікі пішуцца праз злучок.
**Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**9.** Хто з паэтаў з'яўляецца аўтарам наступных вершаваных радкоў?
*Бясследна нішто не міне,* *Ты мост, па якім да мяне*
*Гісторыю слова адродзіць,* *Мінуўшчына ў госці прыходзіць.*
**А)** П. Панчанка. **Б)** П. Макаль. **В)** М. Танк. **Г)** П. Броўка. **Д)** У. Караткевіч.

**10.** Дадзены словы:
*1) радзіма – айчына; 2) брыдкі – прыгожы; 3) адыходлівы – адыходны.*
Якія словы з'яўляюцца паронімамі?
**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** У якіх сказах з прыведзеных на месцы пропуску неабходна напісаць часціцу ***ні***?
*1) Страчанага вясною дня _ купіш. 2) Вясною куды _ глянь – усюды ўсё расце, усё квітнее. 3) Праспяваць лепш не маглі _ Марыля, _ Сымон. 4) Дзе гэты чалавек _ быў?*
**А)** усе сказы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 4. **Д)** 2, 3.

**12.** Вызначце з прапанаваных сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:
*1. Прамільгнула думка, што, знікшы на павароце чыгункі, поезд паклаў сабою рубеж паміж тым, што было раней, і тым, што будзе наперадзе.*
*2. Селянін рухава патрусіў да сваіх саней, узбіў салому, каб латвей было сядзець, паклаў чамаданы, а сам хуценька падабраў сена з-пад каня, узяў лейцы, ускочыў у сані, выцягнуў з саломы пугу.*
*3. Лабановіч уздыхнуў лягчэй, як бы з яго плячэй зваліўся нейкі цяжар, бо дарога, траская і караністая, і лес усё ж такі дакучылі яму.*
**А)** усе сказы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**13.** Які адпаведнік у беларускай мове мае ўстойлівае спалучэнне з рускай мовы *доход не живет без хлопот*?
**А)** хто гоніць, той здагоніць. **Б)** хто дажыве, той паглядзіць.
**В)** хто мае грошы, той добры і харошы. **Г)** хто шмаруе, той і едзе.
**Д)** хто дбае, той мае.

**14.** Дадзены словы: *1) дзядзінец; 2) дзежачка; 3) лістапад; 4) пяшчотны.*
Выберыце словы, у якіх напісанне адпавядае вымаўленню.
**А)** усе словы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2.
**Г)** 1, 2, 4. **Д)** 2, 3.

**15.** У якіх сказах з дадзеных не патрэбна выдзяляць выклічнікі коскай?
*1) О колькі радасці ў вачах дзяцей! 2) Ох ты небарака!*
*3) Эх ты лета гарачае, бурнае! 4) Эх як пахне скошаная трава!*
*5) Ай дарашаю задачу раніцай.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Лічэбнік ***пяцёра*** – … .
**А)** парадкавы просты. **Б)** колькасны складаны. **В)** колькасны састаўны.
**Г)** колькасны зборны. **Д)** колькасны дробавы.

**17.** Дадзены сказы:
*1) Куст бэзу надвячоркам _ здаецца патаемным прывідам.*
*2) Кожны дзень _ музыка гукаў і колераў.*
*3) Факты, канечне, _ рэч важная.*
У якім сказе на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік?
**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** ва ўсіх сказах. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**18.** У якіх сказах выдзеленыя словы напісаны правільна?
*1) Ледзь **не плачучы** пайшоў ён дадому.*
*2) **Не разгаданая** чалавекам тайна існуе і сёння.*
*3) Даўно **не езджаная** дарога зарасла травой.*
**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** усе выдзеленыя словы напісаны правільна.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**19.** Якое значэнне мае ўстойлівы выраз *поўнай жменяй*?
**А)** хутка рабіць што-небудзь. **Б)** цяжка працаваць.
**В)** шчодра, не шкадуючы. **Г)** без цяжкасці.
**Д)** бяздзейнічаць, нічога не рабіць.

**20.** Дадзены словы: *1) чытаць; 2) поні; 3) уверсе; 4) чытаючы.*
Якія з іх маюць канчаткі?
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**21.** Якія сказы з прапанаваных запісаны правільна?
*1) Неба густа ўсеянае зоркамі яшчэ не святлела на ўсходзе.*
*2) Працяты марозам снег іскрыўся, ззяў на сонцы.*
*3) Весялей зірнулі на свет вызваленыя ад холаду дрэвы, кусты.*
**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**22.** Па старой меры лічэння ***60*** у народзе мела назву … .
**А)** трацяк. **Б)** капа. **В)** аршын. **Г)** локаць. **Д)** пядзя.

**23.** Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?
***Давайце** сходзім пасля ў грыбы.*
**А)** дзеясловам. **Б)** прыназоўнікам. **В)** выклічнікам.
**Г)** часціцай. **Д)** злучнікам.